# БЕЛАРУСКАМУ КАМСАМОЛУ — 40 ГОД!

№ 27(418)

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Субота
24
верасня
1960 г.

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ
і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

Цана 10 кап.

## Высокія ўзнагароды

За паспяховае выступленне на XVII Алімпійскіх гульнях 1960 года, за выдатныя спартыўныя дасягненні Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў ардэнамі і медалямі Савецкага Саюза вялікую групу спартсменаў і трэнераў.

У ліку іншых медалем **«ЗА ПРАЦОЎНУЮ ДОБЛЕСЦЬ»** узнагароджан **ГАРАЕЎ Уладзімір Міхайлавіч**, майстар спорту, студэнт нашага універсітэта.

**Медалем «ЗА ПРАЦОЎНУЮ АДЗНАКУ»** ўзнагароджан **ФІНКЕНШТЭЙН Навум Давідавіч**, трэнер па лёгкай атлетыцы, супрацоўнік кафедры фізвыхавання.

## ПАРТЫІ ДОБЛЕСНЫ СЫН

Нам выпала шчасце жыць у цудоўны час, калі здзяйсняецца спрадвечная мара чалавецтва. Камунізм цяпер — не прывід, усё ўяўней, акрэсленей робяцца яго жывыя рысы. Гэтыя рысы жывуць у справах членаў брыгад і ўдарнікаў камуністычнай працы, яны ўвасобіліся ў савецкім касмічным лайнеры, які ўзмыў да зорных вышынь і, падуладны волі савецкага чалавека, апусціўся на нашу, савецкую зямлю.

Шчаслівае сёння нашага народа не выпала яму на долю па волі капрызнага лёсу. У змаганні з царызмам, у агні грамадзянскай вайны заваяваў ён права на светлае будучае, адстаяў у баях з гітлераўскай зграяй. Камуністычная партыя вяла народ на барацьбу і подзвігі, на нябачаныя светам перамогі. І ўвесь час поруч з ёю знаходзіўся яе адданы і доблесны сын — ленінскі камсамол. Разам з партыяй ён узнімаўся на рыштаванні першых сямігодак, садзіўся за руль трактара — і раслі карпусы новых заводаў і фабрык, зніклі палыновыя межы...

Народжаны ў грозны 1920 год камсамол Беларусі адразу стаў у рады будаўнікоў новага жыцця. У тыя гады паэт-камсамолец Паўлюк Трус марыў аб тым часе, калі наша радзіма стане «краем фабрык дымных і машын». Марылі аб гэтым і яго аднагодкі, камсамольцы Беларусі, калі закладвалі падмуркі БелДРЭС'а, Магілёўскага завода штучнага валакна, віцебскай трыкатажнай фабрыкі «КІМ». І вось сёння наш сучаснік Кастусь Кірэенка ад імя ўсіх нас з гордасцю заяўляе:

Не завіце маю рэспубліку  
Краінай цёмных лясоў!  
Паглядзіце—  
Над ёю свецяцца  
Агні завадскіх карпусоў.

Камсамольская ячэйка нашага універсітэта ўзнікла ў 1922 годзе. У армію барацьбітоў за светлае будучае ўліўся новы атрад адданых партыі байцоў. Камсамольцы універсітэта арганізавалі «лёгкую кавалерыю», якая граміла бюракратаў, служылі ў часцях ЧОН'а. Універсітэцкае таварыства «Далоў непісьменнасць» вяло вялікую работу ў горадзе Мінску. Сотні камсамольцаў з'явіліся ў 300 вёсках, дзе вучылі сялян чытаць і пісаць.

Вялікі ўклад унеслі камсамольцы універсітэта ў аднаўленне яго вучэбных карпусоў у першыя пасляваенныя гады.

Мы свята захоўваем слаўныя традыцыі нашых папярэднікаў. Камсамолія універсітэта ўпісала выдатныя старонкі ў летапіс гераічнай барацьбы савецкага народа за асваенне цалінных і аблożных зямель. Аганёк камсамольскай ініцыятывы гарыць у сэрцах студэнтаў чацвёртага курса фізфака. Яны арганізавалі на грамадскіх пачатках курсы для паступаючых на іх факультэт. Па слядах чацвёракурснікаў пайшлі іх малодшыя таварышы — студэнты другога курса. Яны арганізавалі такія ж падрыхтоўчыя курсы на заводзе пластмас.

Добрымі поспехамі ў вучобе адзначан мінулы семестр. 128 камсамольцаў у час летняй сесіі здалі экзамены толькі на «выдатна», 665 — на «выдатна» і «добра».

Настаў час летніх канікулаў. А камсамольцы універсітэта едуць на будаўніцтва Салігорскага камбіната, на трасу газапровада Дашава — Мінск. Яны дапамагаюць будаўнікам узводзіць новы вучэбны корпус універсітэта. 113440 гадзін адпрацавалі студэнты на будаўніцтве! Гэта скромны падарунак камсамольскай арганізацыі універсітэта да свайго свята — 40-годдзя ленінскага камсамола Беларусі.

Уперад, камсамольцы, арлінае племя, на штурм, на ўзяцце новых вышынь!

## ЗАЎТРА, У ДЗЕНЬ СВЯТА

8 г. 30 м. — збор студэнтаў універсітэта ля біякорпуса на ўрачыстае шэсце, прысвечанае слаўнаму юбілею — 40-годдзю ленінскага камсамола Беларусі.

10 г. 30 м. — ускладанне вянкоў да помніка воінам і партызанам, загінуўшым у баях за вызваленне Беларусі.

12 г. — мітынг на плошчы імя Леніна.

З 16 г. — масавае гулянне ва ўсіх парках і скверах, на ўсіх плошчах і вуліцах сталіцы рэспублікі.

З 17 г. — тэатралізаванае прадстаўленне на стадыёне «Дынама» (з удзелам вядомых артыстаў кіно і тэатраў, спартсменаў).

23 г. 30 м. — святочны фейерверк.

## Справы ў іх такія...

### З ПЕРШЫМІ ПРОМНЯМІ СОНЦА

Яшчэ зусім рана, сонца дзесьці адпачывае за лесам, толькі на ўсходзе кавалак неба афарбаваны ў чырвоны колер. Вёска пачынае прасынацца. І раптам — на вуліцы вясёлыя галасы, звонкі смех. Гэта хлопцы і дзяўчаты трэцяга курса беларускага аддзялення спяшаюцца на работу. Калгасніцы, што ідуць па ваду, глядзяць на іх і гавораць:

— Глядзі, якія раннія. І спаць ім не хочацца.

Праўда, спаць крыху хочацца. Той-сёй яшчэ праціраe вочы: ніяк не праходзіць сон. Але прыемная свежасць і ранішні халадок хутка праганяюць дрымоту.

— Э-э, Мікола! Мы зараз табе вядро вады сцюдзёнай на галаву выллем. Што ж ты заспаў? Трэба было ўчора меньш стаяць ля клуба, — жартуюць рабяты з Міколы Бандарэнкі. Ён крыху запазніўся і ўжо толькі за вёскай нагнаў аднакурснікаў.

Вось і калгасны двор. Брыгадзіра яшчэ няма.

— Дзе ён затрымаўся? — хвалюецца Саша Анісімаў. — Мо' думае, што мы яшчэ спім...

Нарэшце, і брыгадзір з'явіўся.

— Вы ўжо тут! — крычыць ён яшчэ здалёк. — А я думаў, прыду першым. Ну, добра. Сёння будзем малаціць. Надвор'е — што трэба. Сцірты ў полі, так што вы ідзіце туды, а я зараз, толькі малатарню адпраўлю.

Усе накіраваліся ў поле.

— Глядзіце, як прыгожа тут! — усклікнула Таня Краўчанка. Які цудоўны ранак!

Ранак і сапраўды быў цудоўным. Усюды ціха-ціха, толькі з вёскі даносіліся галасы. І раптам з-за лесу хлынулі промні ўзыходзячага сонца. Усё стала зусім іншакшым, пазалота заблішчэла на лісцях дрэў, вокны хат заліло чырванню, тысячамі іскрынак загарэліся кропелькі расы на траве.

Праз некаторы час у полі застракатала малатарня. Яна не змаўкала цэлы дзень. І не спыняўся паток машын, гружаных зернем якія накіроўваліся ад малатарні да калгаснага свірна.

— Давай, Саша, варушыся спрытней! — крычала Клава Іваноўская Анісімаву.

Яна падавала снапы са сцірты. Снапы ляцелі адзін за другім так часта, што Саша ледзь паспяваў прымаць іх і класці на барабан.

— Хоць бы адпачыць дала, — жартам прасіў ён.

— Адпачнеш на пенсіі, — кінула ў адказ Клава.

Не адставалі ад іх Вера Канецкая, Вольга Коваль, Таня Краўчанка. Увесь час няспынным патокам лілося зерне ў кузавы машын, і на вачах расла сцірта абмалочанай саломы.

### Рэпартаж

#### ЗА ДЗЕНЬ — 14 ГЕКТАРАЎ

Пад вечар сюды пад'ехаў брыгадзір.

— О, я бачу, вы гатовы і ўночы працаваць. Ну як, змарыліся?

— Не вельмі. Калі б зараз добрага баяніста, ніхто не ўстаяў бы на месцы, — адказаў за ўсіх Коля Бандарэнка. — Так адбівалі б! Асабліва дзяўчаты. Яны ў нас малайцы і да работы здатныя, і на танцах не падкачаюць.

— Добра, добра. Заўтра — на сяўбу. — Брыгадзір абвёў позіркам усіх. — Трэба аднаго чалавека на сеялку. Хто ў вас самы дужы? Мяшкі ўвесь дзень давядзецца падымаць і насіць, так што работа цяжкая...

— Я пайду, — азваўся Анісімаў.

Брыгадзір паглядзеў на мажную, высокую постаць хлапца, на яго рукі, агрубеўшыя за гэтыя дні, на запылены твар.

«Гэты зможа», — зазначыў ён пра сябе. А потым сказаў:

— Значыць, заўтра зранку да сеялкі, астатнія будуць малаціць.

...Да самага вечара не змаўкаў рокат трактара ў полі. Ужо схавалася сонца за лесам, калі трактарыст спыніў машыну.

— Хопіць на сёння. Пойдзем адпачываць, — сказаў ён.

(Заканчэнне на 2 старонцы).

## ДА 40-ГОДДЗЯ КАМСАМОЛА БЕЛАРУСІ

## НА ЎДАРНЫМ, КАМУНІСТЫЧНЫМ...

Некаторыя прахожыя ў здзіўленні спыняліся і праводзілі зацікаўленымі позіркамі мнагалюдныя калоны моладзі, па-святочнаму ўпрыгожаныя лозунгамі і транспарантамі. Бадзёрыя мелодыі духавых аркестраў змяняліся вясёлымі маладзёжнымі песнямі. Але апрануты юнакі і дзяўчаты былі ў спартыўныя касцюмы, зусім не па-святочнаму. Тыя, хто не ведаў аб камуністычным нядзельніку моладзі, прысвечаным 40-годдзю ленінскага камсамола Беларусі, здзіўлена паціскалі плячыма.

Такія шэсці можна было бачыць у мінуўшыя суботні і нядзельны дні на праспекце імя Сталіна. Гэта моладзь Ленінскага раёна актыўна ўключылася ў нядзельнік, ішла ў скверы і паркі, каб правесці там уборку, падрыхтаваць ямкі для пасадкі дрэўцаў. Ішлі калоны студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (здымак унізе), педагагічнага і іншых інстытутаў, тэхнікумаў, вучылішч.

Ужо ў суботу, за кароткі час змяніла сваё аблічча Чырвонаармейская вуліца. Узбочыны яе тратуараў пакрыліся двума роўнымі радамі акуратна выкапаных ямак. Тут папрацавалі каля 2000 студэнтаў навучальных устаноў, якія размешчаны ў Ленінскім раёне.

Нядзельны дзень выдаўся як па заказу. Сонца прыпякала, нібы ў ліпені, і толькі стройны касяк жураўлёў, якія павольна плылі высока ў небе на поўдзень, гаварыў аб тым, што прырода ўсё ж адстойвае свае правы.

Раніцою парк імя 40-годдзя Кастрычніка запоўнілі юнакі і дзяўчаты. Першымі прыйшлі сюды студэнты БДУ імя У. І. Леніна. Некалькі аўтамабіляў ледзь паспявалі падвозіць рыдлёўкі, ламы, кіркі і іншыя прылады. Яшчэ не паспелі студэнты універсітэта размеркаваць паміж сабой абавязкі, як да парку падыйшлі нашы суседзі — студэнты медыцынскага і педагагічнага інстытутаў.

І вось замігцелі ў паветры рыдлёўкі, усюды чуліся жарты, песні, вясёлы смех.

Студэнткі першага курса філалагічнага факультэта Ніна Картавешчанка і Вера Арцёмава папрацавалі на славу. Яны ўдзвюх выкапалі ўжо другую ямку і цяпер Ніна, абапёршыся на рыдлёўку, весела ўсміхаецца, любуючыся сваёй працай (здымак уверсе).

Выдатна папрацавалі на нядзельніку нашы студэнты. Нягледзячы на стомленасць, дадому ўсе разыходзіліся бадзёрыя і задаволеныя.

Э. ДАМАРАЦКІ.





# Справы ў іх такія...

(Пачатак на 1 старонцы).

★ Рэпартаж ★

Зморані вяртаўся Саша Анісімаў дадому. Ламала спіну, нылі рукі. Гэта ж не шэсць гадзін адсядзець у аўдыторыі, а засеяць 14 гектараў. Не жарты. І ўсё ж настрой у хлопца быў бадзёры: у барацьбе калгаснікаў за новы ўраджай ёсць і яго доля працы.

### З ПЕСНЯЙ РАБОТА ІДЗЕ СПАРНЕЙ...

Пра другую групу беларускага аддзялення калгаснікі пачалі гаварыць на другі дзень пасля прыезду.

— Відаць, не беларучкі. Вунь як працуюць!

І сапраўды. Беларучак тут няма. Дзе б ні працавалі трэцякурснікі беларускага аддзялення, усюды іх работай былі задаволены.

...На калгасным таку ідзе ачыстка зерня. Мікола Пашкевіч, расчырванеўшыся і ўспацеўшы, бесперапынна засыпае зерне ў бункер. А два Вячэславы—Рагойша і Міхневіч — хутка і спрытна адстаўляюць напоўненыя мяшкі, завязваюць іх, кладуць на падводу. І ўсё гэта ў іх атрымліваецца так, быццам не лічаныя дні, а гады працуюць яны на калгасным таку.

Іх таварышы Леанід Акаловіч, Віця Красней, Косця Мялешка з самага ранку да позняга вечара прападаюць на полі. Яны ўбіраюць «каралеву палёў». Многа кукурузы пасеяна ў брыгадзе, і цэлымі днямі машыны возяць з поля зялёную масу. 20 гектараў убралі і засіласавалі хлопцы. Добры корм будзе на зіму калгаснай жывёле.

А ў гэты час дзяўчаты ідуць на поплаў. Трэба збіраць лён, ён ужо выляжаўся. Ніхто раней не ведаў, што Валя Гаварэнь і Тася Казловіч могуць так хутка падымаць саломку і звязваць яе ў снапкі. Не горш працуюць студэнткі і на ўборцы бульбы.

— 400 кілаграмаў — вось ваша норма на дзень, — паведаміў брыгадзір.—Не так і мала.

Дзяўчаты прамаўчалі. А калі пад вечар брыгадзір падвёў вынікі, аказалася, што кожная выкапала па 500 кілаграмаў.

— Не чакаў, — здзівіўся брыгадзір. — Я думаў і нормы не выканаеце.

— Вы толькі нас не перахваліце, а то зазнаемся..., — задаволена ўсміхаліся Валя Конаш і Лена Рокач.

## ДА 40-ГОДДЗЯ КАМСАМОЛА БЕЛАРУСІ

Новы дзень прынёс новыя поспехі. Па 600 кілаграмаў клубняў накапалі дзяўчаты.

Садзіцца за лес сонца, канчаецца рабочы дзень. Калгаснікі вяртаюцца дамоў. Нечакана дзесьці зазвінела песня. Задушэўныя галасы дзяўчат гучаць прыгожа і мілагучна, вабяць у нязведаныя далі. Хто ж гэта спявае? Вядома, студэнткі. Песня — іх пастаянны спадарожнік. З ёй і работа ідзе спарней. І спяваюць дзяўчаты не толькі ў полі і па дарозе дадому.

Калі наступае вечар, у хатах запальваюцца агні, студэнты, хуценька пераапрануўшыся і павячэраўшы, ідуць у калгасны клуб. Сюды ж прыходзіць і калгасная моладзь. Агульнымі сіламі яны пачынаюць рэпетыцыю канцэрта, які пакажуць хлебаробам у дзень 40-годдзя камсамола Беларусі.

Пройдзе яшчэ некалькі дзён, раз'едуцца студэнты з калгасаў. Зноў запоўняць універсітэцкія аўдыторыі, якія з нецярплівасцю чакаюць сваіх гаспадароў. Добрую памяць пакінуць яны аб сабе ў паляводаў калгаса «Іскра».

М. ШЫМАНСКІ.



Заўтра — замежная мова. Трэба падрыхтавацца да заняткаў.

НА ЗДЫМКУ: студэнткі першага курса аддзялення журналістыкі Лена Трукшына і Марыя Лазоўская праглядаюць канспекты лекцый.

Фота В. АНЦЫФЕРАВА.

# У гонар юбілею

У гонар 40-годдзя камсамола Беларусі ў корпусе гуманітарных факультэтаў адкрыліся дзве кніжныя выстаўкі-вітрыны. Адна з іх—«Камсамолу Беларусі 40 год». Тут сабрана многа цікавай і разнастайнай літаратуры, якая расказвае аб слаўным шляху, што прайшоў камсамол Беларусі за 40 год. Брашуры «Камсамол Беларусі ў перыяд аднаўлення народнай гаспадаркі 1921—25 гг.» і «Камсамол Беларусі ў гады калектывізацыі сельскай гаспадаркі 1929—34 гг.» даюць падрабязныя звесткі аб слаўных справах нашых камсамольцаў у гэтыя гады.

Беларускія пісьменнікі напісалі многа выдатных твораў, у якіх увекавечылі памяць аб героях-камсамольцах Беларусі. Другая вітрына называецца «Камсамол і моладзь у беларускай мастацкай літаратуры». Тут сабраны творы І. Шамякіна «Трывожнае шчасце», Уладзіміра Дадзіёмава «Над Нёманам», Івана Навуменкі «Сябрытаварышы» і многа іншых кніг, у якіх расказваецца аб гераічных справах беларускай моладзі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама ў часы пасляваеннага будаўніцтва. Пісьменнік Іван Новікаў у сваёй дакументальнай аповесці «Сэрца інакш не можа» расказвае аб слаўнай дачцы беларускага народа Веры Харужай. Нумар часопіса «Маладосць», у якім надрукавана гэта аповесць, таксама прадстаўлены тут.

Акрамя гэтай літаратуры сабрана многа рэспубліканскіх часопісаў, дзе надрукаваны матэрыялы аб працоўных буднях Салігорскага калійнага камбіната, Полацкага нафтабуда, Бярозаўскай ДРЭС, аб моладзі заводаў, фабрык, калгасаў, аб іх сённяшніх працоўных подзвігах.

# На вышыні

*Пасля доўгіх пошукаў мне ўдалося сустрэць прараба Анатолія Аляксандравіча Лабанава ў двары галоўнага корпуса. Мы прывіталіся. Я расказаў, што мне параілі азнаёміцца з работай комплекснай брыгады Канстанціна Букі, якая змагаецца за званне калектыва камуністычнай працы, і кораценька напісаць аб ёй.*

*— Пазнавата. Брыгада Букі на другім аб'екце працуе. Але вы не засмучайцеся. У нас добрых будаўнікоў хоць адбаўляй. Вось хоць бы комплексная брыгада Смірнова. Чым дрэнная? Увесь час ідзе з перавыкананнем плана. Схадзіце, пагаварыце. Добры народ у гэтай брыгадзе, дружны.*

*...Сонечныя праменні, прабіваючы ажурныя стрэлы кранаў, аконныя праёмы, залацістымі ўзорамі ляжаць на лесвічных клетках, пераходных пляцоўках, наспех сколачаных лесвічках, якія ўсё вышэй і вышэй падымаюць мяне.*

*Самымі вышэйшымі пунктамі з'яўляюцца дзве астранамічныя вежы корпуса. На адной з іх працуюць некалькі чалавек з брыгады Смірнова. Адсюль адкрываецца велічная панарама Мінска, з яго плошчамі, вуліцамі, скверамі: прывакзальная плошча з вядомымі варатамі горада — эмблемай Мінска на ўсіх паштоўках, Дом урада, вось прамы, як страла, пабег удалечынь галоўны праспект імя Сталіна. У лёгкай дымцы відаць вялікі і прыгожы тэатр оперы і балету, які акружан дрэвамі ў залацістым уборы.*

*Два хлапцы і дзяўчына, якія працавалі тут, на вежы, не палохаліся такой вышыні. Зачарпнуўшы спецыяльнай лыжкай бітум, які дыміўся, камсамолец Пётр Каваленка роўным пластам разліваў па рубероіду, а яго сябра Уладзімір Шыла раскатваў рулон асбеставай паперы.*

*— Ніначка, аднясі вядро далей, — распараджаўся «Захарыч» (так усе называюць у брыгадзе Пятра Каваленку)—Чакаць няма калі, бітум астыне.*

*І так метр за метрам.*

*Ад Уладзіміра Шылы, які намеснічаў Смірнова, я даведаўся, што ў іх брыгадзе 27 чалавек, працуюць у дзве змены і прыйшлі сюды з самага пачатку будаўніцтва корпуса. Сам ён у 1958 годзе дэмабілізаваўся з радоў Савецкай Арміі і зноў вярнуўся на сваё месца работы.*

*— На двух крайніх пунктах пабываў: у арміі на самым паўднёвым — Кушцы, а тут — на астранамічных вежах корпуса. Ад фундамента да вяршыні — усё прайшло праз мае рукі.*

*У час размовы я ўспомніў, што калі заходзіў у канторку, мне кінуўся ў вочы чырвоны сцяжок з залатымі літарамі: «Брыгадзе, заняўшай І месца ў сацыялістычным спаборніцтве». Пацікавіўся, а чый гэта вымпел?*

*— Брыгады Канстанціна Букі,— адказаў Уладзімір.—Але не ўсё ж ён будзе ў яго. На тое ён і пераходны. Спадзяёмся, што хутка мы ім завалодаем. Ну, Пятро, за работу, нашы ідуць.*

*У гэты час паказаліся Ніна Ласко і хлопец у сінім бярэце, якія неслі вядро з бітумам. Крыху курносы нос, гарэзлівы выраз твару апошняга міжволі выклікалі ўсмешку.*

*— Артыст наш! — не без гордасці заўважыў Пётр. — У тэатральным, на вячэрнім займаецца.*

*Гэта быў чацвёрты член брыгады Смірнова — Валянцін Шух. Але не толькі ён займаецца без адрыву ад вытворчасці. На трэцім курсе бібліятэчнага аддзялення Магілёўскага культурна-асветнага вучылішча завочна вучыцца такелажніца Валянціна Санец. На механічнае аддзяленне індустрыяльнага тэхнікума паступіў сёлета Іван Бадылевіч.*

*— Разумееце, ніводнай вольнай мінуткі, — пачаў расказваць Бадылевіч пасля нашага знаёмства.—Падкінеш дроў, нальеш бітумu — ну, думаеш, адпачну. Але дзе там! Вось гэты начальнік вежавага крана (так жартам называе ён Валянціну Санец) спадцішка займаецца культурна-асветнай работай. Вось і цяпер, усё гаворыць, што пара табе жаніцца, Ванюша.*

*— Сама, напэўна, халасцячка,— перабіў я яго.*

*— Калі б не халасцячка — не раіла б, — бойка праспявала яна і зараз жа, намякнуўшы на сябе, дадала:*

*— Можа і ўгавару.*

*Усе весела засмяяліся.*

*Бадылевіч зірнуў на гадзіннік.*

*— Эй, хлопцы, пара на абед! Мы ўжо сабраліся ісці, як яго напарніца неяк ласкава папрасіла.*

*— Ванюша, камбінезончык мой вазьмі, калі ласка, — і нешта больш блізкае, чым сумесная работа, чулася ў гэтых словах.*

*В. АНЦЫФЕРАЎ.*

# Узнагарода — пуцёўка ў Мінск

Ясным суботнім вечарам да біялагічнага корпуса падыйшоў ззяючы аўтобус. З яго высыпала вясёлая стайка школьнікаў.

Яны ўжо многа чаго цікавага пабачылі ў Мінску. Пабывалі на тонкасуконным камбінаце, гадзіны тры хадзілі з экскурсіяй па гораду. А цяпер рашылі пазнаёміцца з заалагічным музеем універсітэта.

Школьнікаў цікавіць усё. І як гэта чучалы робяцца, і адкуль гэтага пітона завезлі, і з якой хуткасцю бегае страус.

Гэта група экскурсантаў—увесь сёмы клас Быцінскай школы-інтэрната Брэсцкай вобласці. Іх класны кіраўнік Вольга Пятроўна Булыка, завочніца універсітэта, вельмі задаволена сваімі выхаванцамі. Яны перамаглі ў інтэрнацкім конкурсе на клас лепшай вучобы, дысцыпліны, санітарнага стану.

Пераможцам дасталася ганаровая ўзнагарода—двухдзённая паездка ў Мінск.

Я. ЛЯХАЎ.

# Калі прыйшлі дні міру

Адгрымелі апошнія баі Вялікай Айчыннай вайны. Савецкі народ усе свае сілы накіраваў на іншыя франты: залечваць раны, нанесеныя вайной.

З усіх карпусоў універсітэта ўцалеў толькі фізіка-матэматычны. Вось тут і пачалі займацца першыя пасляваенныя студэнты. Жылі мы тады ў цяперашнім хімічным корпусе. Яшчэ існавала картачная сістэма. Студэнтам выдавалі па 600 грамаў хлеба. Не хапала паперы. З усёй універсітэцкай бібліятэкі, адной з буйнейшых у Беларусі, засталося толькі 12 тысяч кніг. Наша аддзяленне рускай мовы, логікі і псіхалогіі займалася з 6 да 12 гадзін вечара. Часта тухла святло, і лекцыі прыходзілася слухаць у пацёмках.

Аднак і ў гэтых умовах студэнты, з якіх амаль усе былі камсамольцы, жылі адным імкненнем: хутчэй адбудаваць універсітэт.

Памятаю, ездзілі мы на станцыю Жодзіна пілiць дровы. Цяжка было, але ніхто не вешаў галавы. Аднойчы прыйшлося прайсці трыццаць кіламетраў пад пралiўным дажджом. Нарэшце, мы на месцы, мокрыя, да нітачкі. Хтосьці выкінуў макарэнкаўскі лозунг: «Не пішчаць!». Крыху прасушыліся, і зазвінелі песні, закіпела праца.

А другая частка студэнтаў адбудоўвала біялагічны корпус. Галодныя, дрэнна апранутыя, яны працавалі на будоўлі. І ўжо ў 1948 годзе ў біякорпусе пачаліся заняткі. А праз год частка студэнтаў перайшла ў новенькі інтэрнат № 1 па вуліцы Свярдлова.

Вельмі вялікую работу правodзіла тады камсамольская арганізацыя. Яна згуртавала студэнтаў у адзіны, дружны калектыў, які спраўляўся з любой працай.

Выдатна працавала універсітэцкая самадзейнасць. Студэнты давалі канцэрты на многіх прадпрыемствах горада. Славіўся тады жаночы дуэт Іры Дзянісавай (цяпер выкладчыца беларускай мовы Ірына Міхайлаўна Шчарбакова) і Эвеліны Блінавай. Цяперашні сакратар універсітэцкага партбюро Аляксей Арсенцьевіч Волк іграў на мандаліне. Універсітэцкім хорам і аркестрам народных інструментаў кіраваў студэнт філфака Мікалай Корсак, які адначасова вучыўся і ў кансерваторыі.

Камсамольцы тых гадоў памятаюць свята 30-годдзя ВЛКСМ. Выдатны літаратурна-музычны мантаж, прысвечаны гэтаму святу, славіўся на ўвесь Мінск. Лібрэта да мантажа напісалі студэнты Сямён Вінагура, Навум Кіслік, Алег Сурскі.

Святам былі для студэнтаў універсітэта дні, калі да іх прыязджалі ў госці студэнты Вільнюскага універсітэта. Гэтыя сустрэчы ператвараліся ў сапраўдныя дэманстрацыі вялікай дружбы. Песні не змаўкалі ні на хвіліну. Таксама па-святочнаму сустракалі мінчан і ў Вільнюсе. Паміж студэнтамі абодвух універсітэтаў вялася ажыўленая перапіска. Гэтая дружба, стаўшая традыцыйнай, жыве і мацнее.

Але галоўнае для студэнтаў— вучоба. І аб ёй памяталі кожную хвіліну. Многія студэнты універсітэта раўняліся на выдатнікаў вучобы, нашых цяперашніх выкладчыкаў Надежду Сямёнаўну Мажэйка, Еўдакію Сцяпанаўну Мяцельскую, Барыса Паўлавіча Міцкевіча (філфак), Аляксея Адамавіча Гусака (фізмат) і яго брата (цяпер аспіранта) Сяргея Гусака і многіх іншых...

Н. ХРЫПКО, кандыдат гістарычных навук



Прывакзальная плошча ў передвячэрні час.

Фота В. АНЦЫФЕРАВА.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31: тэл. 2-07-19.

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

АТ 12131 Зак. 1647

Друкарня выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна.

Тыраж 2000.